**УДК 373.5.091.3:821.161.3-3*У.Караткевіч**

*А. А. Арол*

# ВЫВУЧЭННЕ ТВОРЧАСЦІ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА Ў ПЯТЫМ КЛАСЕ

*У артыкуле на прыкладзе верша “Бацькаўшчына” і казкі “Нямоглы бацька” акрэсліваюцца асноўныя метадычныя падыходы да вывучэння твораў Уладзіміра Караткевіча, якія прадугледжаны праграмай па беларускай літаратуры для пятага класа. Аўтар прыходзіць да высновы, што да асэнсавання гэтых твораў беларускага класіка трэба падыходзіць з адпаведнай адказнасцю. Задача настаўніка не абмяжоўваецца толькі знаёмствам вучняў з мастацкімі адметнасцямі твораў, варта ўлічыць іх велічэзны выхаваўчы патэнцыял.*

Школьная прагарама пятага класа прадугледжвае знаёмства з творчасцю У. Караткевіча на прыкладзе як вершаваных, так і празаічных тэкстаў “Бацькаўшчына”, “Лісце” , “Нямоглы бацька”, “Былі ў мяне мядзведзі”, “Чортаў скарб”, “Кацёл з каменьчыкамі” [1]. Аналіз разнастайных форм і жанраў дазволіць вучням зразумець шматграннасць таленту аўтара і яго ўнікальны ўклад у нацыянальную літаратуру. Настаўнік у сваю чаргу павінен зацікавіць вучняў чытаннем, скіраваць іх увагу на пазнанні мастацкай прыроды літаратурных твораў, іх жыццёва-пазнавальных, мастацка-эстэтычных і каштоўнасна-ацэначных якасцях, сфарміраваць у вучняў уяўленне пра літаратуру як пра чалавеказнаўства і мастацтва слова, якому ўласцівы адметныя спосабы вобразнага адлюстравання жыцця. Разгледзім асаблівасці вывучэння творчасці Уладзіміра Караткевіча ў пятым класе на прыкладзе верша “Бацькаўшчына” і літаратурнай казкі “Нямоглы бацька”.

Пяцікласнікі ўжо знаёмы з асобай Уладзіміра Караткевіча, таму лагічна пачаць урок з паўтарэння і актуалізацыі ведаў. Настаўнік прапануе вучням узгадаць, з якім творам пісьменніка вучні знаёміліся ў трэцім класе (казка “Жабкі і чарапаха”).

Для глыбокага ўспрымання вучнямі верша “Бацькаўшчына” мэтазгодна ўвесці такі этап урока, як псіхалагічная падрыхтоўка да ўспрымання матэрыялу. Мэтазгодна, каб перад першасным чытаннем верша настаўнік з выкарыстаннем нагляднасці расказаў пра нашу Бацькаўшчыну, пра тое, што чалавечая годнасць і вартасць нараджаецца з любові да сваёй зямлі, з ведання і ўшанавання яе гісторыі і спадчыны, з любові да роднага слова. Зараз у сеціве існуе вялікая колькасць пейзажных відэаматэрыялаў, якія суправаджаюцца адпаведнай музыкай. Дадзены фармат відэа папулярны ў сацыяльных сетках, таму вучні не толькі адчуюць настрой верша, але і зацікавяцца тым, што далей будзе адбывацца на ўроку. Пасля прагляду відэа трэба даведацца аб тым, якія эмоцыі яно выклікала ў пяцікласнікаў. Дапаможа ў дасягненні гэтай мэты рэпрадуктыўная гутарка ацэначнага характару.

“Пры выбары метадаў, прыёмаў і форм работы неабходна зыходзіць з дамінантнага спосабу ўздзеяння лірычнага тэксту на чытача” [2], – зазначае А. Брадзіхіна. Звернем увагу на тое, што верш “Бацькаўшчына” напоўнены зрокавымі мастацкімі сродкамі, якія ўзмацняюць яго эмацыйную насычанасць і глыбіню ўспрымання, таму вядучымі прыёмамі на ўроку будуць славеснае маляванне, ілюстраванне, стылістычныя практыкаванні, яны дазволяць вучням не толькі адчуць рытміку і мелодыю верша, але і зразумець змешчаныя ў ім філасофскія развагі, адлюстраваныя ў яркіх вобразах і метафарах аўтара.

Для першаснага знаёмства з творам настаўнік павінен прачытаць яго на памяць класу. Абавязкова зрабіць гэта выразна, з адпаведнай вершу інтанацыяй. Педагогу важна ўразіць вучняў сваім чытаннем верша, каб выклікаць у іх яркую эмацыянальную рэакцыю. Пры першасным успрыманні твора вучні павінны ўважліва слухаць настаўніка з закрытымі падручнікамі, а не сачыць за тэкстам твора. У адваротным выпадку дасягнуць патрэбнай эмацыянальнай рэакцыі не атрымаецца, бо ўвага школьнікаў будзе рассеяна.

Вызначыць першаснае ўспрыманне верша дапамогуць наступныя пытанні:

– Якія пачуцці выклікаў у вас гэты верш? Якія вобразы падаліся вам найбольш яркімі і запамінальнымі?

– Якія пачуцці перажывае герой верша, назіраючы за дарагімі сэрцу краявідамі?

Вельмі важна, каб вучні наблізіліся да тых пачуццяў, што перададзены ў вершаваных радках, і назвалі іх. Герой перажывае радасць і сум адначасова: радасць ад хараства прыроды, а сум па юнацтве, якое нельга вярнуць. Нават самыя простыя і звычайныя рэчы здаюцца чароўнымі.

Далейшым крокам пры аналізе верша з’яўляецца вызначэнне і аналіз мастацкіх сродкаў. Вучні павінны не толькі знайсці ўсе тропы, але і вызначыць іх функцыю. Школьнікі адзначаць, што паэт называе Бацькаўшчыну светлай, таму што яе вобраз выклікае самыя светлыя ўспаміны, а вобраз ракі, якая “ціха цмокае ў сне”, створаны пры дапамозе метафары. Радзіма для паэта і яго героя – месца, дзе ён адчувае сябе шчаслівым і спакойным. Падчас абмеркавання мастацкіх вобразаў і іх ролі ў творы настаўнік з вучнямі могуць стварыць “воблака тэгаў”. Асноўнымі тропамі будуць з’яўляцца эпітэты, метафары і параўнанні (малюнак 1).




Малюнак 1 – Воблака тэгаў

Наступным крокам у працы над вершам пасля яго аналізу можа выступаць праца над выразным чытаннем твора. Гэты этап з’яўляецца вельмі важным пры вывучэнні верша “Бацькаўшчына”.

З мэтай назапашвання ведаў пра адрозненне лірычных і эпічных твораў варта прапанаваць вучням пазнаёміцца з празаічным урыўкам з твора У. Караткевіча. Для выканання гэтай задачы падыдуць заданні тыпу “Параўнайце апісанне прыроды ў паэтычным і празаічным творы і вызначце, дзе больш эмацыянальна выказвае свае пачуцці аўтар? У. Караткевіч пра Беларусь: «*Я хачу правесці вас па зямлі, якая для мяне – і мабыць не толькі для мяне – даражэйшая за ўсё, самы ўтульны і чароўны кут. Якая яна, мая зямля? Гэта залатыя палі збажыны з сінімі вочкамі васількоў, светлыя ад бяроз гаі, што аглухлі ад птушынага звону, і пушчы, дзе горда нясуць свае кроны алені. Гэта бясконцыя жылы рэк, у якіх плешчуцца бабры і рыба на захадзе сонца, і гэта амаль адзінаццаць тысяч азёр, чыстых, як усмешка дзіцяці*»” [3, с. 20]. Вучні павінны прыйсці да высновы, што ў паэтычным творы пачуцці выказаны з значна большай эмацыянальнай глыбінёй і інтэнсіўнасцю, чым у звычайным маўленні, што дазваляе чытачу глыбей адчуць і асэнсаваць перажыванні аўтара.

Перад тым, як распачаць захапляльнае падарожжа ў свет літаратурных казак, ва ўступным слове настаўнік павінен дэталёва і ўважліва акцэнтаваць увагу вучняў на ключавых адрозненнях паміж фальклорнай і літаратурнай казкай, падкрэсліваючы, што першая з’яўляецца жывой часткай народнай культуры, перадаючыся з пакалення ў пакаленне ў вуснай форме, у той час як другая ўяўляе сабой творчую інтэрпрэтацыю аўтара, якая вызначаецца яго адметным стылем і індывідуальнымі мастацкімі прыёмамі, што адлюстроўваюць погляды і сацыяльныя кантэксты свайго часу.

Псіхалагічная падрыхтоўка да ўспрымання казкі “Нямоглы бацька” можа ўключаць праслухоўванне песні “Бацькоўскі зруб” у выкананні нашага земляка Анатоля Ярмоленкі, якая здольна глыбока закрануць душу і ўзбудзіць у вучняў пачуцці, спрыяючы іх уключэнню ў дыскусію.

Першаснае чытанне твора могуць правесці вучні па частках, пасля настаўнік праводзіць рэпрадуктыўную гутарку з мэтай выяўлення першаснага ўспрымання твора:

– Як вы думаеце, чаму Пятро пайшоў супраць існаваўшага ў тыя часы Закона?

– Як вы думаеце, з якой мэтай Пятро кідаў у будан аленевыя косткі?

– Дайце ўласную ацэнку “Старому Закону”.

Пры аналізе казкі “Нямоглы бацька” настаўнік павінен засяродзіць увагу вучняў не толькі на глыбокай ідэйнай тэме любві і шанавання бацькоў, але і на выкарыстанні метафары “нямога бацькі” як сімвала бязмоўнага пакутніка, які, нягледзячы на свае фізічныя абмежаванні, з’яўляецца крыніцай мудрасці і любові, дазваляе глыбей зразумець драматычную сітуацыю герояў. Важна звярнуцца да алегорыі і парабалы, якія акцэнтуюць увагу на маральных уроках і заклікаюць вучняў разважаць пра значэнне сямейных каштоўнасцяў у сучасным свеце. Трэба ўлічыць і аўтарскую мову, насычаную вобразамі і эмоцыямі, дзякуючы якім яна стварае ўнікальную атмасферу, што спрыяе развіццю эмпатыі ў вучняў і запрашае іх да глыбокага аналізу не толькі сюжэта, але і культурнага кантэксту, у якім адбываюцца падзеі. Вучні павінны зразумець, што ўсё гэта з’яўляецца мастацка-стылёвымі прыкметамі казкі і пацвярджэннем бясспрэчнага таленту майстра слова.

На этапе абагульнення настаўнік прапануе вучням разам сфармуляваць “Новы Закон” у выглядзе сінквейна – пяцірадковага нерыфмаванага верша з адметнай будовай, які дазваляе сістэматызаваць інфармацыю. Перад гэтым педагог павінен абавязкова растлумачыць, што такое сінквейн і якая яго структура.

Закон
Справядлівы, адзіны
Любіць, шкадаваць, клапаціцца
Мы ў адказе за бацькоў
Павага

Казка “Нямоглы бацька” насычана дыялогамі, таму мэтазгодным будзе выкарыстанне такіх прыёмаў работы над творам, як чытанне па ролях, складанне цытатнага плана, цытатнай характарыстыкі герояў, на апошнім этапе вывучэння твора – інсцэніраванне. Безумоўна, актуальнымі застаюцца усе віды пераказу і гутаркі, суаднясенне ідэі твора з прыказкамі і г. д.

На заключным этапе вывучэння казкі мэтазгодна прапанаваць дзецям прагледзець мультыплікацыйны фільм “Дзед” і паразважаць, што агульнага паміж ім, народнай казкай “Стары бацька” і літаратурнай казкай “Нямоглы бацька” у якасці дамашняга задання прапанаваўшы алгарытм аналізу і крытэрыі параўнання. Безумоўна, вучні з лёгкасцю вызначаць, што агульнае паміж гэтымі творамі – ідэя павагі да бацькоў, усе яны паказваюць, як важна шанаваць старэйшых людзей, іх мудрасць і жыццёвы вопыт, вучаць юных чытачоў быць спагадлівымі і ўдзячнымі.

Такім чынам, да вывучэння твораў Уладзіміра Караткевіча ў 5 класе настаўніку трэба падыходзіць з адпаведнай адказнасцю. Задача настаўніка не абмяжоўваецца толькі знаёмствам вучняў з тэкстам; яна таксама заключаецца ў тым, каб спрыяць усведамленню выхаваўчага аспекта твора. Пры асэнсаванні верша “Бацькаўшчына” важна дапамагчы вучням зразумець глыбіню эмоцый і думак аўтара, а таксама адчуць сувязь з роднай зямлёй і яе культурай. Настаўнік павінен стаць мастаком, які малюе ў свядомасці вучняў яркія вобразы, натхняючы іх на разважанні аб каштоўнасцях і маральных уроках, закладзеных у паэзіі У. Караткевіча.

Пры вывучэнні казкі “Нямоглы бацька” варта засяродзіцца і на глыбокім аналізе літаратурнай казкі як жанру, уключаючы яе структуру, тэматыку і мастацкія прыёмы.

Настаўнік павінен знаёміць вучняў з паняццем літаратурнай казкі, падкрэсліваючы яе ўнікальнасць і значэнне ў беларускай культуры, а таксама развіваць у дзяцей здольнасць да крытычнага мыслення праз разгляд алегорый і сімволікі, якія прысутнічаюць у творы.

**Літаратура**

1 Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце “Беларуская літаратура” для VII класа ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання, зацв. Пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь 29.06.2023 № 181. – URL: https://adu.by/ru/homeru/obrazovatelnyj-protsess-2023-2024-uchebnyj-god/obshchee-srednee-obrazovanie/uchebnye-predmety-v-xi-klassy/belaruskaya-litaratura.html (дата звароту: 11.04.2025).

2 Брадзіхіна, А. В. Прынцыпы, метады, прыёмы і формыы навучання літаратуры / А. В. Брадзіхіна. – URL: https://elib.gsu.by/bitstream/123456789/41762/1/1.2%20%d0%9f%d1%80%d1%8b%d0%bd%d1%86%d1%8b%d0%bf%d1%8b%2c%20%d0%bc%d0%b5%d1%82%d0%b0%d0%b4%d1%8b%2c%20%d0%bf%d1%80%d1%8b%d1%91%d0%bc%d1%8b%20%d1%96%20%d1%84%d0%be%d1%80%d0%bc%d1%8b%20%d0%bd%d0%b0%d0%b2%d1%83%d1%87%d0%b0%d0%bd%d0%bd%d1%8f%20%d0%bb%d1%96%d1%82%d0%b0%d1%80%d0%b0%d1%82%d1%83%d1%80%d1%8b.pdf (дата звароту: 11.04.2025).

3 Вывучэнне беларускай літаратуры ў 5 класе : дапаможнік для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання / В. У. Праскаловіч [і інш.] ; пад рэд. В. У. Праскаловіч. – Мазыр : Белы Вецер, 2016. – 228 с.

**УДК 811.161.1’367.622’366.2**

***А. М. Беллиева, Г. М. Беллиева***

## АКТУАЛЬНЫЕ ПРИЁМЫ ИЗУЧЕНИЯ СКЛОНЕНИЯ РУССКИХ ИМЁН СУЩЕСТВИТЕЛЬНЫХ

*В статье предпринята попытка сопоставительного анализа грамматики русского и туркменского языков. Исследованы особенности склонения имён существительных в обоих языках, выявлено общее и различное. Показано, как разграничить омонимичные падежные формы русских имён существительных с обращением к туркменскому языку. Приведены актуальные приёмы изучения склонения русских имён существительных иностранными студентами.*

При изучении особенностей склонения существительных в русском языке иностранными студентами из Туркменистана самую большую сложность вызывает определение рода и правильный выбор окончания. В русском языке есть первое, второе и третье склонение, разносклоняемые существительные и существительные, склоняемые как прилагательные (например, *военный, столовая, прошлое*). Отдельную группу составляют заимствованные несклоняемые существительные (*кино, кофе, пальто, жюри*) [1, с. 117]. Наша задача в данной работе – выработать приёмы, которые помогут иностранным студентам разобраться в специфике склонения существительных в русском языке, основываясь на знании грамматики туркменского языка. Для этого мы выбрали и просклоняли существительные каждого типа склонения на русском языке, а затем перевели их на туркменский язык, просклоняли и посмотрели, можно ли ассоциативно соотнести окончания одинаковых падежей в русском и туркменском языках.

Рассмотрим существительные *мама* и *дядя*, относящиеся к первому склонению (таблица 1).